# Чыталі разам

Алена ІЛЬГЯВІЧУЦЕ

**Чарговае мерапрыемства акцыі “Чытаем разам” прайшло ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Карскага.**

Падчас імпрэзы ўдзельнікі – школьнікі, студэнты, выкладчыкі ўніверсітэтаў і коледжаў – узгадалі творы гродзенскіх майстроў слова. Адметнай рысай мерапрыемства было тое, што яго госці маглі не толькі лепш пазнаёміцца з літаратурнай спадчынай землякоў, але і з імі самімі: акцыю “Чытаем разам” наведалі Віктар Кудлачоў, Дзмітрый Радзівончык, Браніслаў Ермашкевіч, Ганна Скаржынская-Савіцкая, Людміла Шаўчэнка, Ірына Фамянкова, Уладзімір Ягорычаў, якія прадэкламавалі радкі сваіх калег па пяру. Па традыцыі, напрыканцы мерапрыемства прысутныя прачыталі адзін з твораў. На гэтай імпрэзе абралі верш Віктара Кудлачова “Намалюю горад Гродна”.

Перспектива (Гродненский район). – 2017. – 31 мая. - С.4